МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
**«РЭСПУБЛІКАНСКІ ЦЭНТР
ЭКАЛОГІІ І КРАЯЗНАЎСТВА»**

вул. Макаёнка, 8, 220114, г. Мінск
тэл. (017) 215-26-23
факс (017) 215-11-68
E-mail: info@rcek.by

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
**«РЕСПУБЛИКАНСКИЙ ЦЕНТР
ЭКОЛОГИИ И КРАЕВЕДЕНИЯ»**

ул. Макаёнка, 8, 220114, г. Минск
тэл. (017) 215-26-23
факс (017) 215-11-68
E-mail: info@rcek.by

30.04.2024 № 374

На ____________ от ____________

Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячы сад № 14 г. Светлагорска»
Гомельскай вобласці

Аб адкрыцці музея

Установа адукацыі «Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства» (далей – Рэспубліканскі цэнтр) разгледзела хадайніцтва аб адкрыцці музея ва ўстанове адукацыі і ў межах кампетэнцыі паведамляе наступнае.

Адкрыццё музея суправаджаецца выкананнем адпаведных заканадаўству патрабаванняў для дзейнасці музея, а таксама метадычных рэкамендацый аб арганізацыі дзейнасці музеяў устаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь (пісьмо Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 15 верасня 2022 г. №. 05-01-13/9287/дс, ад 28.08.2023 № 05-01-14/9614/дс), у якіх акрэслены алгарытм адкрыцця музея ва ўстанове адукацыі і арганізацыя яго далейшай работы.

Рэспубліканскі цэнтр разгледзеў прадстаўленыя ўстановай адукацыі дакументы і задавальняе хадайніцтва аб адкрыцці комплекснага (краязнаўчага) музея «Спадчына» у ДУА «Дзіцячы сад № 14 г. Светлагорска».

Разам з тым, рэкамендуем уключыць у экспазіцыі музея наглядныя інфармацыйныя стэнды, якія пасадзейнічаюць пашырэнню ведаў дзяцей аб гісторыі і культуры краю і дапоўняць музейна-адукацыйную прастору.

Таксама падкрэсліваем аб неабходнасці ўстановы надаваць асаблівую ўвагу арганізацыі ўнутрымузейнага ўліку музейных фондаў і іх захаванасці, якаснаму выкарыстанню музея ў адукацыйным працэсе.

Дырэктар А.У.Ануфровіч

Борбут 320 06 33